работы с ними не должны быть нужны специальные навыки, тем не менее, ученики должны обладать базовой компьютерной грамотностью, а преподаватели иностранных языков – соответствующими компетенциями.

Праконіна В.У.
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

ЭЛЕКТРОННЫ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫ СЛОЎНІК ЯК СРОДАК НАВУЧАННЯ ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ

Узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій абумоўлівае неабходнасць арганізацыі ў навучальных установах больш дасканалых і найбольш эфектыўных сістэм ажыццяўлення вучэбнага працэсу па разнастайных дысцыплінах, у тым ліку і гуманітарнай скіраванасці.

Паспрабуем высветліць як перавагі выкарыстання інфармацыйных тэхналогій пры вывучэнні гуманітарных дысцыплін, так і перавагі працы (дыстанцыйнай) з электронным фразеалагічным слоўнікам для выкладчыкаў і для студэнтаў.

Для выкладчыкаў:

1. Скарачэнне выдаткаў на інфармацыйнае забеспячэнне працэсу навучання. Сучасныя КТ (камп'ютарныя тэхналогіі) дазваляюць істотна знізіць выдаткі на інфармацыйнае суправаджэнне выкладаемых дысцыплін за кошт выкарыстання ЭВМ і падключаных да іх разнастайных мультымедыйных сродкаў, здольных узнаўляць як статычную, так і дынамічную візуальную і аўдыёінфармацыю. Гэтая эканомія датычыць выдаткаў на:

- грашовыя рэсурсы. Інфармацыя ў лічбавым выглядзе каштуе значна танней, чым у аналагавым. Таксама, амаль заўсёды, больш эканомнымі з'яўляюцца працэсы падрыхтоўкі, збору, захавання і транспарціроўкі лічбавай інфармацыі);
- часавыя рэсурсы. Выдаткі часу на працэс падрыхтоўкі электроннага варыянту слоўніка ў большасці выпадкаў ніжэйшыя за часаёмкасць працэсу падрыхтоўкі аналагічнага забеспячэння на традыцыйных носьбітах (папяровыя носьбіты, відэа- і аўдыёкасеты, слайды і г.д.).

2. Павышэнне якасці заняткаў. Выкарыстанне ІТ (інфармацыйных тэхналогій) і КТ дазваляе узбагаціць і павялічыць колькасць суправаджальнай інфармацыі па выкладаемых дысцыплінах.

3. Скарачэнне часавых выдаткаў на зваротную сувязь. Выкарыстанне камунікатыўных магчымасцяў глабальнай інфармацыйнай сеткі Інтэрнэт дазваляе паскорыць працэс зваротнай сувязі з навучэнцамі шляхам прымянення тэхналогій электроннай пошты і г. д.

4. Павышэнне якасці дадатковага інфармацыйнага суправаджэння працэсу навучання. Сучасныя КТ і ІТ дазваляюць якасна палепшыць працэс атрымання навучэнцамі дадатковай інфармацыі па вывучаемых дысцыплінах (фразеалогіі беларускай і рускай моў). Гэта можа быць арганізацыя электронных бібліятэк, правядзенне Інтэрнэт-канферэнцый, стварэнне электронных зборнікаў навуковых прац, арганізацыя інфармацыйных перыядычных Інтэрнэт-выданняў і г. д.

5. Магчымасць арганізацыі дыстанцыйнай формы навучання. Выкарыстанне тэхналогій сеткі Інтэрнэт дазваляе арганізаваць працэс навучання са студэнтамі, якія знаходзяцца ў любой кропцы планеты. Пры гэтым становіцца магчымым не толькі перадача неабходных для навучання заданняў, своечасовы і якасны кантроль іх выканання, але таксама трансляцыі лекцыйных заняткаў па выкладаемых дысцыплінах.

Для студэнтаў:

1. Магчымасць аператыўнага атрымання кансультацый. Выкарыстанне камунікацыйных магчымасцяў сеткі Інтэрнэт дае магчымасць імгненна перадаць інфармацыю любога тыпу, што дазваляе ў рэжыме рэальнага часу праводзіць кансультацыі са студэнтамі завочнай і дыстанцыйнай формамі навучання.

2. Магчымасць атрымання доступу да электронных тэкстаў па вывучаемай дысцыпліне (фразеалогіі беларускай і рускай моў). КТ дазваляюць выкладчыкам, валодаючы мінімальнымі практычнымі навыкамі працы з ЭВМ, падрыхтаваць электронны канспект лекцый па выкладаемай дысцыпліне, а выкарыстанне сеткі Інтэрнэт дазваляе навучэнцам атрымаць доступ да гэтых канспектаў з любой кропкі планеты.

3. Павышэнне ступені засваяльнасці матэрыялу. Магчымасць выкарыстання выкладчыкамі больш шырокага і разнастайнага спектру суправаджальнай інфармацыі па чытаемых дысцыплінах дазваляе спрасціць успрыманне студэнтамі лекцыйнага матэрыялу і павысіць ступень яго засваяльнасці.

Выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у даследаваннях па фразеалогіі можна прасачыць на ўзоры стварэння слоўніка беларуска-рускіх фразеалагізмаў з кампанентамі-назоўнікамі *«душа», «сэрца»*.

Трэба адзначыць, што фразеалагізмы ўзнікаюць у нацыянальных мовах на аснове такога вобразнага ўяўлення рэчаіснасці, якое адлюстроўвае эмпірычны, гістарычны ці духоўны вопыт моўнага

калектыву, які, безумоўна, звязаны з яго культурнымі традыцыямі. Пры супастаўленні беларускіх і рускіх фразеалагічных адзінак неабходна ўлічваць праблемы ўзаемадзеяння і ўзаемасувязі беларускай і рускай моў і культур. Канцэпты *«душа»* і *«сэрца»* з'яўляюцца духоўнымі цэнтрамі ў беларускай і рускай моўных карцінах свету.

ІТ, з дапамогай якіх быў створаны ўзор электроннага беларуска-рускага фразеалагічнага слоўніка, дазваляе ў параўнальна-супастаўляльным аспекце прасачыць спецыфіку фразеалагічных адзінак. З матэрыялаў слоўніка становіцца відавочным, якія фразеалагізмы з'яўляюцца безэквівалентнымі, напрыклад: бел. *абуць (сваё) сэрца ў лапці* або рус. *ад кромешный на душе (на сердце),* а якія маюць адпаведнікі ў адной з моў: бел. *адкрываць (раскрываць) душу* – рус. *открывать сердце*, бел. *ад (усяго, самага) сэрца* – рус. *от всего сердца* і г. д.

Найбольш зручнымі і прыдатнымі для складання электроннага слоўніка варта прызнаць HTML-тэхналогіі, таму што менавіта HTML-мова з'яўляецца мовай гіпертэкставай разметкі і прызначана для ўсталявання гіпертэкставых асацыятыўных спасылак паміж разнастайнымі інфармацыйнымі элементамі і іх фрагментамі, прадстаўленымі ў выглядзе файлаў ЭВМ. Акрамя таго, HTML-мова валодае неабходнымі сродкамі фарматавання тэксту і арганізацыі прадстаўлення інфармацыі.

Пры стварэнні электроннага слоўніка важнай задачай з'яўляецца вылучэнне асобных гіпертэкставых блокаў, якія адпавядаюць логіцы прадстаўлення інфармацыі, і ўсталяванне ўзаемасувязі паміж гэтымі блокамі. Каранёвым HTML-файлам з'яўляецца sloynik.html. Ён утрымлівае беларускія і рускія фраземы як «пустыя» спасылкі. Калі адзінка з'яўляецца безэквівалентнай, то спасылкі на яе няма. Калі фразеалагізм мае адпаведнік у адной з моў (беларускай ці рускай), то пры націсканні на яго найменне мы бачым адпаведна эквівалент гэтага ўстойлівага выразу.Пры дапамозе Javascript у сваю чаргу быў створаны файл, у якім апрацоўваюцца падзеі звароту да гіперспасылкі. ІТ забяспечваюць кампактнасць і зручнасць слоўніка: мы адразу ж бачым эквівалент фразеалагізма, калі такі ёсць, а таксама крыніцу, адкуль ён быў узяты.

Крыніцамі фактычнага матэрыялу паслужылі «Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы» (ФСБМ) І.Я. Лепешава ў 2 т., «Фразеологический словарь русского языка» (ФСРЯ) пад рэд. А.І. Малаткова, «Фразеологический словарь современного русского литературного языка» (ФССРЛЯ) пад рэд. А.М. Ціханава [16, 17], «Фразеологический словарь русского литературного языка» (ФСРЛЯ)

пад рэд. А.І. Фёдарава. Фактычная база налічвае 185 беларускіх і 138 рускіх фразеалагічных адзінак.

Такім чынам, выкарыстанне сучасных КТ і ІТ у працэсе навучання гуманітарным дысцыплінам забяспечвае атрыманне істотных пераваг, што пацвярджае актуальнасць і неабходнасць іх выкарыстання ў навучанні замежнай мове.

Літаратура

1. Белоногов, Г.Г. Компьютерная лингвистика и перспективные информационные технологии / Г. Г. Белоногов. – М.: Русский мир, 2004. – 248 с.
2. Болотников, И.М., Головин, В.В. Информационные технологии в гуманитарном образовании / И.М. Болотников, В.В. Головин. – СПБ: СПбГУКИ, 2005. – 234 с.
3. Зубов, А.В., Зубова, И.И. Информационные технологии в лингвистике: Учеб. пособие для студ. лингв. фак-тов высш. учеб. заведений / А.В. Зубов, И.И. Зубова – М.: Издательский центр «Академия», 2004. – 208 с.

Кривонос Е.А.
Белорусский государственный университет, Минск

БАЗА ЗНАНИЙ «ЗНАЧЕНИЯ ПРЕДЛОЖНО-ПАДЕЖНЫХ ФОРМ ИМЕН СУЩЕСТВИТЕЛЬНЫХ» КАК СТРУКТУРНЫЙ ЭЛЕМЕНТ СИСТЕМЫ УПРАВЛЕНИЯ ЗНАНИЯМИ «ЭКОНОМИКА$_1$»

Система управления знаниями по языку специальности «Экономика$_1$» – СУЗ ЯСЦ «ЭКОНОМИКА$_1$» – информационная система, предназначенная для хранения и управления знаниями о языке конкретной специальности (в нашем случае, экономические дисциплины) для организации образовательного процесса. Система является приложением локального расположения на персональном компьютере и разработана на основе гипертекстовых технологий, технологий Microsoft, JavaScript. Архитектура СУЗ ЯСЦ «ЭКОНОМИКА$_1$» представлена *базами знаний*: «Значения предложно-падежных форм имен существительных», «Основные деривационные модели», *базами данных*: «Имена существительные», «Глаголы», «Предлоги».

Актуальность моделирования базы знаний (БЗ) для автоматизации работы преподавателя русского языка как иностранного (РКИ) обусловлена лингво-методической необходимостью в организации